УДК 398.3

**В. Ю. Гронская**
*Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», Брэст*

# ВОБРАЗЫ ПТУШАК У НАРОДНЫХ ПАРЭМІЯХ БЕЛАРУСАЎ

**Уводзіны.** Птушкі ў традыцыйнай карціне свету беларусаў і іншых славян вылучаюцца ў асобную групу, або клас, паводле дзвюх дыферэнцыяльных прыкметаў — локусу (неба, паветра) і модусу перамяшчэння («лётаць»), а прыкмета множнасці або адзінкавасці выступае ў адносінах да іх як інтэгральная. Птушкі — гэта лятаючыя ў паветры істоты, прадстаўленыя ў народнай культуры як зборна (у аднароднай ці неаднароднай множнасці), так і індывідуальна (адзінкава). У птушак ступень індывідуалізацыі значна меншая, чым у звяроў. У традыцыйнай культуры найбольш індывідуалізаваны вобразы зязюлі і бусла, якім належыць адно з цэнтральных месцаў у птушынай сімволіцы. Выразней, чым у іншых жывёлаў, у птушак выяўляецца апазіцыя «чысты/нячысты», якая ахоплівае амаль усіх птушак і супадае з апазіцыяй «бясшкодны/драпежны». Да нячыстых птушак адносяцца, галоўным чынам, драпежныя і шкодныя: усе во́раны, сарока, ястраб і начныя драпежнікі (сава, філін, сыч), а таксама верабей, удод, гагара, качка, кулік і лятучая мыш. Да чыстых адносяць голуба, ластаўку, жаваранка, крыжадзюба, бусла, лебедзя. Таксама птушак, у залежнасці ад суаднясення з жанчынай ці мужчынам, можна падзяліць на жаночых і мужчынскіх «персанажаў». Яшчэ адной асаблівасцю, якая дазваляе выдзяляць птушак з агульнага ліку жывёл, з'яўляецца акустычная характарыстыка, якая займае адно з цэнтральных месц у птушынай сімволіцы. Акрамя таго, у народных уяўленнях птушкі могуць выступаць як вобразы душ [1, с. 527].

**Асноўная частка.** З усіх жывёл птушкі найбольш цесна звязаны з каляндарным цыклам, якому падпарадкоўваецца ўся земляробчая ды жывёлагадоўчая дзейнасць чалавека. Лад жыцця большасці птушак (менавіта пералётных) звязаны са зменай надвор'я, пораў года, з рухам сонца. Таму паводзіны птушак з'яўляюцца адным з фактараў, які арганізуе саму структуру народнага календара, а значыць, птушкі адметна ўдзельнічаюць у самім яго фарміраванні [2]. Невыпадкова з паводзінамі птушак звязана вялікая колькасць прыкмет, у першую чаргу метэаралагічных. Так, па паводзінах птушак можна вызначыць, якім будзе лета: *«Птушкі ўюць гнёзды на сонечным баку — к халоднаму лету, на ценявым — к цёпламу»* (фальклорна-этнаграфічны архіў фальклорна-краязнаўчай лабараторыі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, кіраўнік І. А. Швед (далей — ФЭАБ); Рубель, Столінскі р-н). Нярэдка вобразы птушак фігуруюць у народных прыказках, звязаных з надыходам пэўных каляндарных святаў, прычым птушкі маюць такі ж высокі сатус, як і людзі, прыкладам: *«На Благовешчанне дзеўка косу нэ пляце, птушка гнэзда нэ ўе»* (ФЭАБ; Кустын, Брэсцкі р-н).

У традыцыйнай культуры вобраз птушкі функцыянуе як сімвал, які абазначае чалавека, што адлюстравана ў парэміях тыпу: *«Всяка пташка свае гнязло хваліць»* (ФЭАБ; Новая Мыш, Баранавіцкі р-н), *«Ранняя птушка дзюбу вытэрае, а позняя гочэ продырае»* (ФЭАБ; Закозель, Драгічынскі р-н). У такіх фальклорных тэкстах абыгрываюцца чалавечыя якасці і паводзіны. Так як птушкі цесна звязаны з земляробчым календаром, то лагічным з'яўляецца выкарыстанне арніталагічных вобразаў у парэміях, якія характарызуюць працоўную дзейнасць: *«Усялякая птушка сваім носам корміцца»* [3, с. 65]. Аналагічнай для прыказкі *«Па адзежы сустракаюць, па розуме выпраўляюць»* з'яўляецца *«Па пер'і птушку ўзнаюць»* [4]. Галоўнай характарыстыкай птушак з'яўляецца здольнасць іх лётаць, якая абыгрываецца ў прыказках: *«Усе птушкі крыллі маюць, да не ўсе лятаюць»* [5].

Традыцыйнай культурай амаль усім птушкам прыпісваецца здольнасць вымаўляць розныя слоўныя воклічы і нават цэлыя выказванні. Вербальная перадача птушыных крыкаў складае аснову адмысловых гукапераймальных тэкстаў як адной з разнавіднасцяў малых формаў фальклору [6]. Голас для птушкі мае такую ж функцыю, як і праца для чалавека, таму ў некаторых выпадках парэміі, якія характарызуюць птушку, пабудаваны па той жа схеме, што і парэміі, якія характарызуюць чалавека: *«Які гаспадар, такая і гаспадарка»* — *«Якая птушка, такі і галасок»* [7].

Традыцыйная свядомасць некаторых птушак (у прыватнасці, бусла, вераб'я, сокала, салаўя) надзяляе медыятыўнымі здольнасцямі (сувязь паміж чалавечым і не-чалавечым светамі), якія раскрываюцца ў парэміях, звязаных з прадказаннем розных прыродна-касмічных з'яў. Так, народная культура надзяліла бусла адзначанай пасрэдніцкай функцыяй, якая матывавала ўзнікненне групы прыкмет, што прадказваюць з'яўленне новых індывідаў у сям'і: *«Калі каля хаты бусел звіў гняздо, то ў гэтай хаце будзе папаўненне»* (ФЭАБ; Падгорная, Баранавіцкі р-н). І шырэй — бусел становіцца «вешчуном» (ці падацелем) сямейнага дабрабыту: *«як обачыш бусла ў гнэздзе, то до доброго сямейнага жыцця»* (ФЭАБ; Міхнавічы, Бярозаўскі р-н).

Метэапрагназуючая функцыя птушак часцей за ўсё звязана з апазіцыяй «надвор'е/непагадзь» (ясна/дождж): *«Как низко ласточки летают, то, говорят, как дождя нет, а птица начнёт низко*

© Гронская В. Ю., 2015

Репозиторий БарГУ

*летать…, вот старые люди староверы говорили: “Ой скоро будет дождь, потому что птицы низко летают”»* (ФЭАБ; Вельямовічы, Брэсцкі р-н).

Сувязь птушак з іншасветам, з душамі памерлых абумовіла ўзнікненне шэрагу прыкмет, дзе раскрываецца здольнасць прадвяшчаць. Прычым інфармацыя, якая паступае пры пасрэдніцтве птушак, часта носіць негатыўны характар, рэдка — нейтральны. Так, аднесенасць савы да нячыстых птушак, яе сувязь з першастыхіяй, у прыватнасці, з пякельным агнём, верагодна, матывавала фарміраванне адмоўных канатацый у фальклорнага вобраза гэтай птушкі. Гэта абумовіла ўзнікненне прыкмет, якія змяшчаюць інфармацыю негатыўнага характару: *«Колы сова будэ кугукать каля хаты, то будэ пожар. Было так, што сядэ на крыж, то гэто яшчэ горш. Будэ велікы пожар»* (ФЭАБ; Селаўшчына, Бярозаўскі р-н). Прыкметы тыпу *«недаром сарока шчабятала, гасцей казала»*, *«сарока шчакечыць — гасцей кажыць»* (у варыянце: госця жджэ/госць будзе) [8] звычайна носяць нейтральны характар — паведамляюць аб прыбыцці гасцей.

Традыцыйная культура надзяляе некаторых птушак (у прыватнасці бусла, голуба) апатрапейнай функцыяй. Так, аднесенасць голуба да чыстых, святых птушак матывуе ўзнікненне ахоўнай функцыянальнасці гэтай птушкі. Лічыцца, што голуб ахоўвае ад непрыемнасцяў: *«Вот, если голубь поселится на доме или ещё где-нибудь, то тот дом обойдут всякие беды. Считается, что он как бы охраняет ту семью»* (ФЭАБ; Селаўшчына, Бярозаўскі р-н).

**Заключэнне.** Птушка з'яўляецца неад'емнай часткай беларускай (шырэй — славянскай) міфалогіі, з чым звязана функцыянальнасць арніталагічнага вобраза ў парэміях. Адзначым, што птушкі ў традыцыйнай карціне свету беларусаў вылучаюцца ў асобную групу паводле дзвюх дыферэнцыяльных прыкметаў — локусу (неба, паветра) і модусу перамяшчэння («лётаць»). Апазіцыя «чысты/нячысты» з'яўляецца галоўнай класіфікуючай прыкметай, якая падзяляе арніталагічныя вобразы ў межах адной групы/класа. Медыятыўная здольнасць птушак, іх сувязь паміж чалавечым і прыроднакасмічным светам стала асновай для фарміравання парэмій, дзе адлюстравана функцыянальнасць птушак (метэапрагназуючая, вяшчальная, апатрапейная).

### Спіс цытуемых крыніц


1. Гура А. В. Символика животных в славянской народной традиции. М. : Индрик, 1997. 910 с.
2. Там жа. С. 529.
3. Беларуская народная творчасць. Прыказкі і прымаўкі. У 2 кн. / рэд. А. С. Фядосік. Мінск : Навука і тэхніка, 1976. Кн. 1. 560 с.
4. Там жа. С. 65.
5. Там жа. С. 65.
6. Гура А. В. Символика животных в славянской народной традиции. С. 530.
7. Беларуская народная творчасць. Прыказкі і прымаўкі. С. 65.
8. Там жа. С. 67.


Матэрыял паступіў у рэдакцыю 11.05.2015 г.

**УДК 378.147**

**Н. В. Ермалович**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи*

## ДИАЛОГИЗАЦИЯ ПРОЦЕССА ОБУЧЕНИЯ В УЧРЕЖДЕНИИ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ КАК УСЛОВИЕ ФОРМИРОВАНИЯ КУЛЬТУРЫ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ РЕЧИ БУДУЩЕГО УЧИТЕЛЯ-ФИЛОЛОГА

**Введение.** Современные социальные условия формируют у людей потребность в овладении диалогическим способом мышления. Чтобы добиться успехов в профессиональной деятельности, необходимо уметь представлять свою точку зрения, доказывая правильность выдвинутых положений, творчески включаться в процесс межличностной коммуникации. Коммуниканты должны быть активными, деятельными, обладающими гибкостью мышления, конструктивностью общения с оппонентами.

Педагогическая профессия как одна из коммуникативно ответственных областей деятельности требует от современного учителя умения вести коммуникативный диалог, а также проявления профессиональной гибкости и находчивости. В связи с этим проблема формирования культуры профессиональной речи в процессе подготовки будущих филологов является достаточно актуальной.

© Ермалович Н. В., 2015



Репозиторий БарГУ